Источник: **«Наша слова» - 2013-02-27**

# Зорка гісторыка Гужалоўскага

14 лютага 2013 года ў кніжным салоне па вуліцы Калініна адбылася творчая сустрэча з гісторыкам Гужалоўскім. У 2004 годзе ён напісаў цудоўную кнігу "Музеі Беларусі 1941-1991гг.", пра якую я пісаў у 2006 годзе ў СМІ.

У салоне грамадскасць сабралася з нагоды яго новай кнігі **"Чырвоны аловак: нарысы па гісторыі цэнзуры ў БССР"**.

У дыскусіі прынялі ўдзел Анатоль Вялікі, Эмануіл Іофэ, Сяргей Тарасаў, Алесь Карлюкевіч і іншыя асобы. Кнігу выдала рэдакцыя газеты "Звязда". Яе наклад 1100 асобнікаў!

На грунце вялікага аб'ёму архіўных дакументаў, перыёдыкі, сучасных даследаванняў у кнізе ўпершыню паказана гісторыя стварэння і функцыянавання сістэмы партыйна-дзяржаўнага інфармацыйнага кантролю ў БССР у 19191941 гг. чытачы зазірнуць у "святая святых" савецкай ідэалогіі - Галоўлітбел і Галоўрэперткам, якія доўгія гады ажыццяўлялі інфармацыйную і культурную палітыку камуністычнай партыі, даведаюцца пра цэнзурныя лёсы літаратурных і мастацкіх твораў, сродкаў масавай інфармацыі і культурнай спадчыны Беларусі...

Рэцэнзентамі кнігі з'яўляюцца доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі М.П. Касцюк і доктар філалагічных навук, член - карэспандэнт НАН Беларусі М.І. Мушынскі.

Трэба адзначыць, што Алесь Гужалоўскі некаторы час жыў і працаваў у ЗША, а гэтую кнігу пісаў тры гады. Выданне ажыццёўлена па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кніга адрасавана гісторыкам, філолагам, журналістам, культуролагам, студэнтам гуманітарных спецыяльнасцей, а таксама шырокаму колу чытачоў, якія імкнуцца глыбей зразумець гісторыю Беларусі. Мерапрыемства закончылася аўтограф - сесіяй славутага і таленавітага гісторыка Алеся Аляксандравіча Гужалоўскага.

***Аляксей Шалахоўскі,*** *гісторык.*